Песню бярыце з сабою...

# ЗАБЛУДЗІСЯ Ў БЭЗАВЫМ ТУМАНЕ

Рубрыку вядзе
Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com



**Генадзь Пашкоў (нар. 23.03.1948) — вядомы беларускі паэт, перакладчык, публіцыст. Скончыў журфак БДУ. У розныя гады працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, адказным сакратаром рэдакцыі часопіса «Полымя», дырэктарам выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя П. Броўкі, першым сакратаром Саюза пісьменнікаў Беларусі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.**

**Вершы — Генадзь ПАШКОЎ,**
**музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

*1.* *Заблудзіся ў бэзавым тумане*
*і пачуеш ля прыціхлых хат,*
*як звініць, звініць — не перастане —*
*вечаровым звонам саду сад.*

***Прыпеў:***
*Салаўю жалейка падпявае, —*
*і такі у песні гэтай клёк,*
*што да слёз пяшчотаю кранае*
*уватканы ў пояс васілёк.*

*2.* *Ацішэў, залёг пасля паводкі*
*загуляка Нёман у траве.*
*На зямлі радзімай дым салодкі,*
*і туман шчаслівы ў галаве.*

***Прыпеў.***

*3.* *Ад любві не раздзімай пажару,*
*а схілі ціхмяна галаву,*
*пакланіся ў пояс хлебадару,*
*пакланіся нізка салаўю.*

***Прыпеў.***

*4.* *І праці ў апошні дзень...*
*Як літасць,*
*як глыток апошні, папрашу:*
*не з нагоды нейкай*
*урачыстасць —*
*гэты май хай вернецца ў душу...*

***Прыпеў.***




## Беларусь выступіць у альтэрнатыўным «Еўрабачанні»

**Белтэлерадыёкампанія прыняла рашэнне ўдзельнічаць у тэлевізійным праекце «Еўрабачанне: Europe Shine a Light». Еўрапейскі вяшчальны саюз зладзіць яго як альтэрнатыву адмененаму песеннаму конкурсу.**

Пасля рашэння аб адмене міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020» прадзюсарская група прапанавала новую ідэю — музычную праграму, дзе жыўцом выступяць пераможцы і зоркі «Еўрабачання» розных гадоў, а артысты конкурсу, які не адбыўся сёлета, скажуць свае словы падтрымкі людзям са ўсяго свету, якія пацярпелі ад каранавіруса і працягваюць барацьбу з ім. Паколькі ў выпадку згоды ўсіх патэнцыяльных удзельнікаў задуманы двухгадзінны канцэрт не змесціць усе песні цалкам, будуць прадстаўлены самыя яркія 30-секундныя фрагменты выступленняў.

«Сярод удзельнікаў Europe Shine a Light, які тэлеканал «Беларусь 1» пакажа ў прамым эфіры 16 мая, будуць і пераможцы нашага нацыянальнага адбору, гурт VAL», — расказала «Звяздзе» **кіраўнік прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі Святлана СМАЛОНСКАЯ-КРАСКОЎСКАЯ.** Лера і Улад выканаюць урывак са сваёй беларускамоўнай песні «Да відна» і перададуць у відэапаштоўцы цёплыя пажаданні мільёнам гледачоў па ўсім свеце. Плануецца таксама, што вядучыя канцэрта Шанталь Янзен, Эдсілія Ромблі і Ян Сміт правядуць са студыі ў Нідэрландах тэлемасты з краінамі-ўдзельніцамі.

Шоу, якое адбудзецца 16 мая, пакажуць 45 краін: акрамя непасрэдных тэлекампаній—удзельніц Еўропы і Аўстраліі, да тэлевізійнага праекту далучацца Боснія і Герцагавіна, Казахстан, Косава і Чарнагорыя. Каментаваць яго для беларускіх гледачоў будзе, як звычайна, Яўген Перлін. А пакуль што на YouTube-каналах і афіцыйным сайце конкурсу eurovision.tv праходзіць серыя «Дамашніх канцэртаў «Еўрабачання».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Даты | Падзеі | Людзі

## 24 КРАСАВІКА

У краіне

**1886** год — нарадзіўся Марк Аляксандравіч Асвяцімскі, беларускі палітычны дзеяч. У 1919—1920 гг. — член ЦК Беларускай Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, у 1919—1924 гг. — старшыня яе Слуцкага камітэта, член культурна-асветніцкага таварыства «Папараць-кветка». У 1919 і 1921 гадах быў арыштаваны. У 1924-м адышоў ад палітычнай дзейнасці. У 1938-м арыштаваны і прыгавораны да найвышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1960 годзе.

**1903** год — нарадзіўся Леў Пятровіч Мацкевіч, беларускі архітэктар. Сярод работ — генпланы Оршы, Полацка, плошчы Якуба Коласа ў Мінску, праспекта Незалежнасці, праект дэталёвай планіроўкі Мінска да 2000 года.

**1907** год — у Мінску выйшаў першы нумар газеты «Жыццё правінцыі» (замест забароненай царскімі ўладамі газеты «Голас правінцыі»). Выдавалася да 31 мая 1907-га. Публікавала інфармацыю пра падзеі ў горадзе. Прызнавала нацыянальную самастойнасць беларусаў, крытыкавала шавіністычную палітыку царызму і польскай буржуазіі ў Беларусі.

**1910** год — нарадзіўся Анатоль Міхайлавіч Вязаў, артыст цыркa, заслужаны артыст Беларусі (1964). У Саюздзяржцырку працаваў з 1927-га акрабатам, клоўнам у масцы Чарлі Чапліна. Вынаходнік і асноўны выканаўца арыгінальнага гімнастычнага нумара — паветранага палёту без сеткі з амартызатарам. Здымаўся ў фільмах «Цырк», «Два-бульда-Два», «Дзяўчынка на шары».

**1995** год — Рэспубліка Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны з Народнай Рэспублікай Ангола.

**1995** год — 24—29 красавіка ў Маскве адбыліся Дні культуры Рэспублікі Беларусь, прысвечаныя 50-годдзю перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У свеце

**1620** год — нарадзіўся Джон Граўнт, англійскі сатырык, якога прынята лічыць родапачынальнікам навукі дэмаграфіі. На падставе даных аб смяротнасці і нараджальнасці ў Лондане за некалькі дзесяцігоддзяў ён распрацаваў матэматычную мадэль, якая дазваляе вызначаць прагноз па колькасці і структуры насельніцтва.

**1845** год — нарадзіўся Карл Фрыдрых Георг Шпітэлер, швейцарскі паэт, раманіст і эсэіст, нобелеўскі лаўрэат 1919 года.

**1905** год — нарадзіўся Роберт Пен Уорэн, амерыканскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Начны вершнік», «Уся каралеўская раць», вершаваных зборнікаў.



**1970** год — Кітай запусціў свой першы штучны спадарожнік Зямлі «Дунфан Хун-1». У 1992 годзе краіна пачала рэалізацыю праектаў пілатуемых касмічных палётаў. 15 кастрычніка 2003 года кітайскі касманаўт Ян Лівэй здзейсніў першы пілатуемы палёт у космас на караблі «Шэньчжоў-5».

Так гаварыў...

**СТАНІСЛАЎ ЕЖЫ ЛЕЦ:**
*«Тоўсценькія жывуць менш, затое ядуць больш».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.48 | 20.29 | 14.41 |
| Віцебск — | 5.34 | 20.22 | 14.48 |
| Магілёў — | 5.38 | 20.19 | 14.41 |
| Гомель — | 5.39 | 20.11 | 14.32 |
| Гродна — | 6.03 | 20.43 | 14.40 |
| Брэст — | 6.08 | 20.39 | 14.31 |

## Месяц

*Маладзік 23 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Анціпа, Івана, Прохара, Пятра, Рыгора, Якава.*
***К.*** *Валерыі, Аляксандра, Аляксея, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Мама, я дужы, я спраўлюся!**
**— Сынок, будзь разумны, нават не бярыся...**

— Колькі будзе два на два?
— Восем.
— Колькі?
— Шэсць.
— Падумайце.
— Чатыры.
— Чаму ж вы адразу не сказалі?
— Мама вучыла заўсёды гаварыць больш, каб было куды саступаць!

**— Скажыце, гэта вы ўчора выцягнулі з палонкі майго Абрамчыка?**
**— Так.**
**— І магу я спытацца, дзе тады яго шапачка?**




Вожык

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1291.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 красавіка 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12